ПАЛАЖЭННЕ
аб аказанні платных адукацыйных паслуг
у дзяржаўнай установе адукацыі
“Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа”

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае палажэнне аб платных адукацыйных паслугах у дзяржаўнай установе адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа” распрацавана ў адпаведнасці з:

Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 13.01.2011 № 243-З (у рэдакцыі Законаў Рэспублікі Беларусь ад 13.12.2011 № 325-З, ад 26.05.2012 № 376-З, ад 04.01.2014 № 116-З, ад 18.07.2016 № 404-З);

Падатковым Кодэксам Рэспублікі Беларусь ад 29.12.2009 № 73-З; Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.07.2013 № 641 “Аб зацвярджэнні палажэння аб парадку фарміравання пазабюджэтных сродкаў, ажыццяўлення расходаў, звязаных з дзейнасцю, накірунках і парадку выкарыстання сродкаў, што прыносіць даходы, якія застаюцца ў распараджэнні бюджэтнай арганізацыі”;

Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.07.2011 № 99 “Аб зацвярджэнні тыпавых форм дагавораў у сферы адукацыі” (у рэдакцыі ад 06.07.2012 № 75);

Інструкцыяй аб парадку складання, разгляду і зацвярджэння бюджэтных каштарысаў, каштарысаў даходаў і расходаў пазабюджэтных сродкаў бюджэтных арганізацый, зацверджанай пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 17.10.2013 № 66 (у рэдакцыі ад 26.08.2014 № 57, ад 02.12.2016 № 103);

Статутам установы.

1.2. Установа адукацыі мае права аказваць платныя адукацыйныя паслугі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам, дадзеным Палажэннем, Статутам установы адукацыі.

Сфера аказваемых платных адукацыйных паслуг вызначаецца наяўнасцю запыту насельніцтва, узроўнем жыцця, інтарэсамі асобных груп насельніцтва, рэальнымі магчымасцямі задавальнення запыту (станам матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы, наяўнасцю кваліфікаваных кадраў).

2. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ ПЛАТНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ

2.1. Платныя адукацыйныя паслугі не могуць быць аказаны ўзамен ці ў межах асноўнай адукацыйнай дзейнасці (у межах асноўных адукацыйных праграм, дзяржаўных адукацыйных стандартаў, што

фінансуюцца са сродкаў бюджэту).

2.2 Аказанне платных адукацыйных паслуг не можа наносіць шкоду або пагаршаць якасць аказання асноўных адукацыйных паслуг.

2.3. Гімназія самастойна вызначае магчымасці і аб’ём аказання платных адукацыйных паслуг, зыходзячы з наяўнасці матэрыяльных і кадравых рэсурсаў, запыту на адпаведныя паслугі.

2.4. Платныя адукацыйныя паслугі могуць аказвацца толькі са згоды заказчыка (законных прадстаўнікоў вучняў) на аснове пісьмовай заявы і дагавора.

2.5. Патрабаванні да аказання платных адукацыйных паслуг вызначаюцца па ўзгадненні бакоў.

2.6. Нагрузка на вучня вызначаецца з улікам запытаў законных прадстаўнікоў вучняў у адпаведнасці з патрабаваннямі Санітарных норм, правіл і гігіенічных нарматываў (далей – СанПін).

2.7. Прадастаўленне платных адукацыйных паслуг у дзяржаўнай установе адукацыі “Гімназія № 36 г. Гомеля імя І.Мележа” афармляецца дагаворам паміж заказчыкам і выканаўцам, якім рэгламентуюцца ўмовы і тэрміны іх аказання, кошт паслуг і парадак разлікаў, правы, абавязкі і адказнасць бакоў.

2.8. Выканаўца абавязаны забяспечыць аказанне платных адукацыйных паслуг у поўным аб’ёме ў адпаведнасці з умовамі дагавора аб аказанні платных адукацыйных паслуг.

2.9. Гімназія павінна валодаць адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай, вучэбна-метадычнай базай, якая садзейнічае стварэнню ўмоў для якаснага прадастаўлення платных адукацыйных паслуг без ушчамлення рэалізацыі асноўнай адукацыйнай дзейнасці, у адпаведнасці з патрабаваннямі СанПіНа, якія гарантуюць ахову жыцця і бяспекі здароўя заказчыка.

2.10. Для аказання платных адукацыйных паслуг дапускаецца выкарыстоўваць вучэбныя і іншыя памяшканні гімназіі ў гадзіны, якія не прадугледжаны раскладам вучэбных заняткаў у межах асноўнай адукацыйнай дзейнасці.

## 3. ПАРАДАК ПРАДАСТАЎЛЕННЯ ПЛАТНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ

3.1. Пры наяўнасці ўмоў у гімназіі для арганізацыі прадастаўлення платных адукацыйных паслуг неабходна:

3.1.1. вывучыць запыты на платныя адукацыйныя паслугі і вызначыць мяркуемую колькасць спажыўцоў;

3.1.2. стварыць умовы для правядзення платных адукацыйных паслуг, якія гарантуюць ахову і ўмацаванне здароўя вучняў;

3.1.3. выдаць загад аб арганізацыі канкрэтных відаў платных

адукацыйных паслуг, які вызначае кадравы склад, заняты прадастаўленнем гэтых паслуг, назначэнні службовых асоб, адказных за выкананне арганізацыйна-метадычных і абслуговых функцый.

3.1.4. Распрацаваць службовыя інструкцыі работнікаў, якія ажыццяўляюць платныя паслугі.

3.1.5. Заключыць дагаворы (або кантракты) аб аказанні платных паслуг з работнікамі, якія выказалі жаданне ў вольны ад асноўнай работы час выконваць абавязкі па прадастаўленні платных адукацыйных паслуг. Для аказання платных адукацыйных паслуг выканаўца можа прыцягваць спецыялістаў з іншых установаў, арганізацый шляхам заключэння дагавораў платнага аказання паслуг з аплатай за кошт сродкаў, што атрымліваюцца ад аказання платных адукацыйных паслуг.

3.1.6. Арганізаваць раздзельны ўлік рабочага часу педагагічных работнікаў, якія вядуць асноўную адукацыйную дзейнасць, і педагагічных работнікаў, якія аказваюць платныя адукацыйныя паслугі.

3.1.7. Забяспечыць заказчыка да заключэння дагавора бясплатнай, даступнай і дакладнай інфармацыяй аб установе і платных адукацыйных паслугах.

3.2. Інфармацыя, якая даводзіцца да заказчыка, павінна знаходзіцца ў зручным для агляду месцы і змяшчаць наступныя звесткі: поўнае найменне і месца знаходжання выканаўцы, віды платных адукацыйных паслуг, у тым ліку пералік паслуг, які ўключаны ў дагавор, кошт платных адукацыйных паслуг у адпаведнасці з зацверджаным прэйскурантам цэн (тарыфаў) на бягучы год, форму дагавора на аказанне платных адукацыйных паслуг, звесткі аб рэжыме работы ўстановы, рэжыме прадастаўлення платных адукацыйных паслуг (расклад, графік работы).

3.3. Выканаўца абавязаны прадаставіць па патрабаванні заказчыка для азнаямлення: статут, узор дагавора на аказанне платных адукацыйных паслуг, іншыя звесткі па просьбе заказчыка, якія адносяцца да дагавора і адпаведнай адукацыйнай паслугі, любыя звесткі, якія датычацца дагавора аб платнай адукацыйнай паслуге.

3.4. Спосабамі даведзення інфармацыі да заказчыка могуць быць: аб'явы, у тым ліку на сайце ўстановы.

3.5. Дагавор на аказанне платных адукацыйных паслуг заключаецца ў адпаведнасці з Пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.07.2011 № 99 "Аб зацвярджэнні тыпавых форм дагавораў у сферы адукацыі" (у рэдакцыі 28.04.2018 № 30).

3.6. Дагавор складаецца ў двух экземплярах, адзін з якіх знаходзіцца ў выканаўцы, другі – у заказчыка.

3.7. Заказчык абавязаны аплаціць прадастаўляемыя адукацыйныя паслугі ў парадку і ў тэрміны, указаныя ў дагаворы.

3.8. Аб’ём аказваемых платных адукацыйных паслуг і іх кошт у дагаворы вызначаюцца па пагадненні паміж выканаўцам і заказчыкам.

3.9. Дагавор з заказчыкам на аказанне платных адукацыйных паслуг заключаецца ў кожным канкрэтным выпадку персанальна, на пэўны тэрмін і павінен прадугледжваць характар паслугі, памер і ўмовы аплаты паслугі, правы і абавязкі дагаворных бакоў, парадак змянення і скасавання дагавора, парадак вырашэння спрэчак, асаблівыя ўмовы. На працягу абумоўленага перыяду магчыма заключэнне дадатковых пагадненняў да дагавора па кошце навучання.

3.10. Выканаўца заключае дагавор з заказчыкам пры наяўнасці магчымасці аказаць патрэбную платную адукацыйную паслугу і не мае права аддаваць перавагу якой-небудзь фізічнай асобе адносна заключэння дагавора, акрамя выпадкаў, прадугледжаных законамі і іншымі нарматыўнымі прававымі актамі.

## 4. ФАРМАВАННЕ ЦЭН (ТАРЫФАЎ) НА ПЛАТНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ПАСЛУГІ

4.1. Фарміраванне цэн (тарыфаў) на платныя адукацыйныя паслугі заснавана на прынцыпе поўнай кампенсацыі затрат установе на аказанне платных адукацыйных паслуг, пры якой цана складаецца на аснове кошту затрачаных на яе ажыццяўленне рэсурсаў. Цэны (тарыфы) разлічваюцца на аснове планавых затрат, усіх відаў устаноўленых падаткаў, плацяжоў у адпаведнасці з падатковым і бюджэтным заканадаўствам.

4.2. Пры фарміраванні цэн на платныя паслугі ўлічваюцца наступныя віды затрат: аплата работы, налічэнне на аплату працы, набыццё прадметаў забеспячэння і расходных матэрыялаў, аплата камунальных паслуг, іншыя бягучыя расходы, рэнтабельнасць.

4.3. Разлік кошту платных паслуг складаецца Гомельскім гарадскім цэнтрам па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый у сферы адукацыі (далей – Цэнтр).

4.4. Аплата заказчыкамі платных адукацыйных паслуг ажыццяўляецца праз аддзяленні банкаўскай сістэмы або тэрміналы штомесяц да 31 чысла бягучага месяца згодна з дагаворам, на разліковы рахунак упраўлення адукацыі Гомельскага гарвыканкама. Не дапускаецца спагнанне наяўных грошай.

4.5. Кіраўнік установы адукацыі мае права самастойна ў кожным асобным выпадку (з улікам канкрэтных абставін) вырашаць пытанне аб тым, ці з’яўляюцца тыя ці іншыя прычыны адсутнасці вучня ва ўстанове ўважлівымі. У выпадку хваробы вучня ці кіраўніка плата за гэты перыяд не спаганяецца. Залішне налічаная плата ўлічваецца ў наступных плацяжах.

4.6. Ад аплаты за ўказаную платную паслугу поўнасцю вызваляюцца дзеці-сіраты; дзеці са шматдзетных сем'яў (пры ўмове, што ўсе вучні сям'і, з'яўляючыся вучнямі дадзенай установы адукацыі, наведваюць аб'яднанні на платнай аснове); на 30% – дзеці воінаў-інтэрнацыяналістаў, дзеці сем'яў сацыяльна небяспечнага становішча.

4.7. Заработная плата педагогам вызначаецца зыходзячы з фактычна адпрацаванага часу згодна з табелем уліку рабочага часу, які штомесяц прадастаўляецца гімназіяй у Цэнтр.

## 5. ПАРАДАК РАЗМЕРКАВАННЯ ДАХОДАЎ АТРЫМАНЫХ АД АКАЗАННЯ ПАСЛУЕ НА ПЛАТНАЙ АСНОВЕ

5.1. Даходы, якія прыносяць платныя адукацыйныя паслугі, расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам: Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.07.2013 № 641, Пастановай Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь ад 17.10.2013 № 66, Палажэннем аб размеркаванні сродкаў ад дзейнасці, якая прыносіць даходы.

5.2. Па выніках дзейнасці, якая прыносіць даходы, не больш як 40 працэнтаў ад сумы перавышэння даходаў над расходамі, што застаецца ў распараджэнні арганізацыі, накіроўваецца на прэміраванне работнікаў (уключаючы кіраўніка ўстановы адукацыі, намесніка кіраўніка), занятых аказаннем платных паслуг (не больш як 40 %), выплату падаткаў на заработную плату, аплату тэхнічных расходаў па зместу і эксплуатацыі асноўных фондаў і маёмасці, набыццё матэрыяльнай і вучэбнай літаратуры. Астатнія сродкі да 60% накіроўваюцца на развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы. Пры гэтым пазабюджэтныя сродкі матэрыяльнага заахвочвання могуць выкарыстоўвацца на прэміраванне і аказанне матэрыяльнай дапамогі работнікам, вучням, устанаўленне надбавак работнікам за высокія творчыя і вытворчыя дасягненні ў працы. Пазабюджэтныя сродкі на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстановы выкарыстоўваюцца на бягучыя расходы (камунальныя паслугі, паслугі транспарту, паслугі сувязі і іншыя расходы, звязаныя з асноўнай дзейнасцю) пры адсутнасці або недастатковасці бюджэтных асігнаванняў.

5.3. Пазабюджэтныя сродкі расходваюцца ў адпаведнасці са спецыяльна складзенымі каштарысамі, зацверджанымі кіраўніком. Не выкарыстаныя ў справаздачным перыядзе сродкі канфіскацыі не падлягаюць і выкарыстоўваюцца ў наступных перыядах ва ўстаноўленым парадку.

## 6. АДКАЗНАСЦЬ БАКОЎ І КАНТРОЛЬ ЗА АРГАНІЗАЦЫЯЙ І ДАСТАВАННЕМ ПЛАТНЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ ПАСЛУГ

6.1. Выканаўца аказвае платныя адукацыйныя паслугі ў парадку і ў тэрміны, вызначаныя дамовай.

6.2. Заказчык платных адукацыйных паслуг абавязаны: аплаціць кошт паслугі ў тэрміны, указаныя ў дагаворы, выконваць іншыя патрабаванні, прадугледжаныя дагаворам.

6.3. Акрамя адказнасці перад заказчыкам, установа адукацыі нясе адказнасць: за жыццё і здароўе вучняў у час аказання платных адукацыйных паслуг, за парушэнне правоў і свабод вучняў і работнікаў, за выкананне заканадаўства аб працы і ахове працы, за іншыя дзеянні і бяздзеянні, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.4. Кіраўнік установы нясе персанальную адказнасць: за выкананне дзеючых нарматыўных дакументаў у сферы аказання платных адукацыйных паслуг, пры заключэнні дагавораў на аказанне гэтых паслуг, за арганізацыю і якасць платных адукацыйных паслуг, за рэзультатыўнасць і мэтавае выкарыстанне грашовых сродкаў, атрыманых ад аказання платных адукацыйных паслуг, за іншыя дзеянні, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

6.5. Адукацыйныя паслугі арганізуюцца па запытах законных прадстаўнікоў з улікам стану здароўя вучняў і рэкамендацый медыцынскіх работнікаў.

6.6. Заняткі з вучнямі ў рамках платных паслуг у сферы адукацыі і паслуг, якія спадарожнічаюць атрыманню адукацыі, арганізуюцца па групах і індывідуальна з улікам наступных патрабаванняў: заняткі павінны праводзіцца ў свабодных памяшканнях (класах), у залах для музычных заняткаў і заняткаў па фізічнай культуры або ў спецыяльна абсталяваных памяшканнях, заняткі павінны праводзіцца з улікам стану здароўя вучняў, напаўняльнасць груп павінна быць не больш за 12-15 вучняў, індывідуальныя заняткі не больш за аднаго вучня.

7. ЗАКЛЮЧЭННЕ

7.1. Сапраўднае Палажэнне зацвярджаецца дырэктарам гімназіі.

7.2. У дадзенае Палажэнне могуць уносіцца змены і дапаўненні.

7.3. Упраўленне адукацыі, спорту і турызму Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта мае права: ажыццяўляць кантроль выканання дзяржаўнай установай адукацыі дзеючага заканадаўства ў частцы арганізацыі платных паслуг, прыпыняць дзейнасць дзяржаўнай установы адукацыі па аказанні платных паслуг, калі гэтая дзейнасць ажыццяўляецца на шкоду асноўнай дзейнасці, супярэчыць гэтаму Палажэнню, а таксама дзеючаму заканадаўству Рэспублікі Беларусь.